ЯНКА КУПАЛА

НА НАШЫМ ПОЛІ



ЯНКА КУПАЛА

НА НАШЫМ ПОЛІ



ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя дзіцячай літаратуры
Мінск 1953

Малюнкі Л. Лейтмана



НА НАШЫМ ПОЛІ

На нашым полі,
Полі калгасным,
Дзянькі праходзяць
Весела, ясна.

Дружна працуем
Мы грамадою,
Знацца не знаем
З горам, з бядою.

Пры нашым ладзе,
Пры калектыўным,
Рукам падмогай
Служаць машыны.

Болей не знаем
Сох на загонах, —
Трактар нам цягне
Плугі, бароны.

Сонейка ўзыйдзе,
Сонейка зайдзе,
Сеем і полем
Шчыра, папраўдзе.

Сеем, збіраем
Спелае збожжа,
Сабе, краіне
Багацце множым.



АБВІЛАСЯ КРАІНА У КВЕТКІ

Абвілася краіна
У кветкі,
Кліча сонца і месяц
У сведкі.

Ураджай даюць буйны
Палеткі,
Збожжа поўныя гумны,
Паветкі.

Весяляцца старыя
І дзеткі,
Што прыбытак ад працы
Ў іх гэткі;

Што мінулі батрацтва
Наследкі,
Не ядуць болей панскіх
Аб'едкаў.

Абвілася краіна
У кветкі,
Кліча сонца і месяц
У сведкі.



Я — КАЛГАСНІЦА

Я — калгасніца
Маладая —
Жыву весела,
Ані дбаю.

Мае дзетачкі
Позна-рана
І накормлены,
І прыбраны.

Сваю Настачку —
Дзіцё тое —
Нясу ў яслі я
Раніцою.

А Данілачка,
Важным хлопцам,
Рады бегае
На пляцоўцы.

А як выйду я —
Іхня маці —
Ды калгаснае
Жыта жаці, —

Густа сцелюцца
Ўслед снапочкі,
Пяю песенькі
Аж да ночкі.

Супакойна я
Ўжо за дзетак,
Сваіх родненькіх
Малалетак.

Я — калгасніца
Маладая —
Жыву весела,
Ані дбаю.





ПОЛЕ

Люблю цябе, поле,
Вясёлай вясною,
Як ты зарунішся
Ўсякай збажыною.

Люблю цябе летам,
Як красуе ніва,
Як шуміць ад ветру
Радасна, шчасліва.





Люблю цябе, поле,
Восенню прыгожай,
Як напоўніш пуню
Умалотам збожжа.

Люблю тады нават
Цябе, маё поле,
Як над табой жудка
Зімка заскуголе.

Поле маё, поле,
Як-жа ты мне міла!
Як люблю цябе я
З усёй моцы, сілы!





МАЙ

Да нас у госці май прыходзіць,
Як не прыходзіў у вяках,
Спявае песні аб свабодзе
На полі, ў моры, ў рудніках.

Спявае дзецям калыханкі,
Прыгожыць кветкамі сады,
Вядзе сялянаў і сялянак
На шлях шчаслівы, малады.

Прыходзіць май зялёны ў госці,
А з падарункамі ідзе,
Уцеху буйнай сыпле горсцю
Святочна ўбранай грамадзе.



ЛЕТАМ

Звоніць поле доляй, воляй,
Звоніць поле ў каласкі.
Ў буйным лузе ззяюць, граюць
Кветкі, мошкі, матылькі.

Рэчка ўецца і смяецца
Да зялёных лоз і вольх,
А ў вадзіцы шыбка рыбка
Мігаціць на паплаўкох.

Лес адвечны, бесканечны
Цягне-цягне гоман свой.
Між хвой скачуць птушкі-ўюшкі
І пяюць, пяюць гурмой.



ЛЁН

Як на поле, на зямлю
Прышла раніца вясны,
Я пасеяла ў раллю
Жмені зёран ільняных.

Як расці стаў, як падрос,
Як лісткі ўзняў дагары, —
Лён палола з ранніх рос
Да вячэрняе зары.

Як адцвіў ды як надзеў
Лён галоўкі на сябе,
Быў не горш, як у людзей,
Мела шчасце я ў сяўбе.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!





РЭЧКА

Між гор, далінаю, за вёску,
Не аглядаючыся ўзвыш,
Спаважна, папрасту, пасвойску
Бяжыш ты, рэчка, і бяжыш.

Падгоніш каменьчык жвіровы,
Травінку водную трасеш,
Чапаеш караньчык альховы,
Паверсе кветачку нясеш.

І лёд зімой табе не шкодзіць —
Ўсё коцішся, а цёплым днём
На бераг выглянеш разводдзем
Дый потым — зноў сваім слядком.





ДУБ

Распусціўшы вецце
У глухім прыволлі,
Сам адзін расце ён
На далёкім полі.

Думны, кучаравы,
Аб нічым не дбае,
Ці то стогне бура,
Ці віхор гуляе.

На адным ён месцы
Днюе і начуе,
Многа казак знае,
Многа песень чуе.

Дождж падмыў карэнне,
У ім дупло, як хата...
Ён стаіць і дрэмле —
Грозны, расахаты.



ДАРОГІ

Дарогі вы шасейныя,
Шчаслівыя дарогі,
Істужкамі пасласіся
На нашыя разлогі.

Праз поле ураджайнае,
Тарфяныя балоты,
Праз пушчы векавечныя
Ляглі вы пазалотай.

Ніколі вы не дрэмлеце:
Ад ранку і да ранку
Па вас машына коціцца
І конная фурманка.

І пешаходам весела —
Малодшы ён ці старшы, —
Байцы Чырвонай Арміі
Ідуць паходным маршам.

Грузавікі з таварамі
Бягуць ва ўсе староны,
З лістамі віншавальнымі
Шнуруюць паштальёны.

Злучылі з гулкім горадам
Спакойныя разлогі,
Дарогі вы шасейныя,
Шчаслівыя дарогі.

З бяспуцця непраходнага,
З калдобін-катлавінаў
Ты вышла, ордэносная,
На роўны шлях, краіна!






НОВАЯ ВОСЕНЬ

Па-новаму восень палеткі
Абходзіць, глядзіць гаспадаркі...
Пайшлі аддыхаць пад паветкі,
Згуляўшы дажынкі, жняяркі.

У вырай сабраліся гусі,
І жораў азваўся пад небам...
Плывуць па шляхах Беларусі
Абозы чырвоныя з хлебам.

Асенняе сонца спакойна
Ў прасторах нямых пахаджае...
Гуляе пад сцягам чырвоным
Калгаснае свята ўраджаю.





СОСНЫ

Сосны выносныя,
Гордыя сосны!
Шмат вы ўжо носіце
Сонечных вёснаў.

Вас, супакойныя,
Вецер калыша,
Думкі ўзнімаеце
Шумам і цішай.

Тыя-ж на поўначы —
З вёснаў да вёснаў —
У сцюжнай Карэліі
Высяцца сосны.

Тыя-ж на поўдзені,
Над цёплым морам,
Сосны ахуталі
Крымскія горы.

Сосны далёкія,
Блізкія сосны!
Сэрцу вы любыя
З вёснаў да вёснаў.

Вас адзінакава
Вецер калыша,
Думкі ўзнімаеце
Шумам і цішай.



МОЙ КРАЙ

Цвіці-ж, каласуйся, мой край,
Ці сонейка захад, ці ўсход!
Аб Сталіне песні спявай,
Спявай, беларускі народ!

Дзе вечная пустка была,
Там горад паўстаў і расце.
А стужкай чыгунка лягла,
Дзе ўчора стаяў лес яшчэ.

Шасцяць у калоссі сярпы,
Сцяною дабро залягло,
Кладуцца снапы у снапы, —
Такога жніва не было.

Звініць песня ў полі, звініць,
Уторыць сярпу і касе,
Бурліцца вадзіца з крыніц,
Купаецца сонца ў расе.

Цвіці-ж, каласуйся, мой край,
Ці сонейка захад, ці ўсход!
Аб Сталіне песні спявай,
Спявай, беларускі народ!



ЗМЕСТ

На белорусском языке

Я. Купала

На нашем поле

Государственное издательство БССР
Минск 1953

*

ДЛЯ МАЛОДШАГА ЎЗРОСТУ

Рэдактар *А. Якімовіч*
Мастацкі рэдактар *Н. Гуціеў*
Тэхнічны рэдактар *В. Варыёнчык*
Карэктар *А. Фёдарава*

АТ 03901. Падпісана да друку 7 I—1953 г. Тыраж 20 000 экз.
Папера 70×92$^{1}/_{16}$. Пап. арк. 0,625. Друк. арк. 1,46. Вуч.-выд. арк. 1,1.
Цана 1 руб. Зак. 459.

Друкарня імя Сталіна, Мінск, праспект імя Сталіна, 105.

Цана 1 руб.



